© Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
**Установа адукацыі «Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў»**

## РТ–2018/2019 гг. Этап ІІІ

## Тэматычнае кансультаванне па беларускай мове

## Варыянт 1

| **Заданне.<br>Адказ** | **Разбор задання** | **Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу** | **Вучэбны дапаможнік** |
|---|---|---|---|
| **А1.** Адзначце прыклады, у якіх выдзеленыя словы напісаны правільна:<br>1) палявыя ***дзьмухаўцы***;<br>2) Гомельская ***Вобласць***;<br>3) свята ***Каля́ды***;<br>4) горны ***Інжынер***;<br>5) камедыя ***«Паўлінка»***.<br><br>**Адказ:** 1,3,5 | 1) *палявыя* ***дзьмухаўцы*** → назоўнік, які абазначае назву расліны, з'яўляецца агульным і пішацца з малой літары;<br>2) *Гомельская* ***вобласць*** → назоўнік, які абазначае родавую назву адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі, з'яўляецца агульным і пішацца з малой літары;<br>3) *свята* ***Каля́ды*** → назоўнік, які абазначае назву свята, з'яўляецца ўласным і пішацца з вялікай літары;<br>4) *горны* ***інжынер*** → назоўнік, які абазначае назву прафесіі, з'яўляецца агульным і пішацца з малой літары;<br>5) *камедыя* ***«Паўлінка»*** → назоўнік, які абазначае назву літаратурнага твора, з'яўляецца ўласным і пішацца з вялікай літары | Фанетыка і арфаэпія. Арфаграфія. Культура маўлення. Правапіс агульных і ўласных назоўнікаў | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 9.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; §§ 18, 27 |
| **А2.** Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску трэба пісаць літару ***а***:<br>1) р_цэпт;<br>2) характ_рыстыка;<br>3) пр_снаводны;<br>4) праш_птаць;<br>5) мн_ганацыянальны.<br><br>**Адказ:** 2,4 | 1) *рэцэ́пт* → пасля зацвярдзелага зычнага [***р***] у сярэдзіне запазычанага слова і не пад націскам захоўваецца літара ***э***;<br>2) *характ**а**ры́стыка* → запазычанае слова, у якім у адпаведнасці з беларускім літаратурным вымаўленнем не пад націскам пішацца літара ***а***;<br>3) *прэснаво́дны* → у першай частцы складанага слова і не пад націскам захоўваецца літара ***э***;<br>4) *прашаптáць* → спрадвечна беларускае слова, у якім не пад націскам гук [***э***] пераходзіць у гук [***а***], што і перадаецца на пісьме: *шэ́пт – шаптáць*; | Фанетыка і арфаэпія. Арфаграфія. Культура маўлення. Правапіс галосных ***о***, ***э***, ***а*** | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 1. Мінск: НІА, 2014; § 34.<br>**В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 2. Мінск: НІА, 2014; § 33.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: |

| Заданне. Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| | 5) *мн**о**ганацыяна́льны* → націск падае не на першы склад другой часткі складанага слова, таму ў першай яго частцы пішацца літара ***о*** | | вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; §§ 15, 26 |
| **А3.** Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску трэба пісаць літару ***я***:<br>1) б_ражлівы;<br>2) кра_знаўчы;<br>3) по_с;<br>4) л_сніцтва;<br>5) сп_ктакль.<br><br>**Адказ:** 2,3,4 | 1) *б**е**ражлі́вы* → спрадвечна беларускае слова, у якім не ў першым пераднаціскным складзе пішацца літара ***е***;<br>2) *кра**я**зна́ўчы* → складанае слова, у якім пішацца злучальная літара ***я***, бо націск падае на першы склад другой яго часткі;<br>3) *по́**я**с* → спрадвечна беларускае слова, у якім незалежна ад месца націску захоўваецца каранёвая этымалагічная літара ***я***;<br>4) *л**я**сні́цтва* → спрадвечна беларускае слова, у якім у першым складзе перад націскам пішацца літара ***я***;<br>5) *сп**е**кта́кль* → запазычанае слова, у якім незалежна ад месца націску пішацца літара ***е*** | Фанетыка і арфаэпія. Арфаграфія. Культура маўлення. Правапіс галосных ***е***, ***ё***, ***я*** | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 1. Мінск: НІА, 2014; § 35.<br>**В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 2. Мінск: НІА, 2014; § 33.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 15 |
| **А4.** Адзначце прыклады, у якіх выдзеленыя словы напісаны правільна:<br>1) новы ***ўніверсам***;<br>2) цётка ***Ўсціння***;<br>3) ***полны*** рукзак;<br>4) медыцынскі ***сімпозіум***;<br>5) позні ***ўсход***.<br><br>**Адказ:** 1,4,5 | 1) *новы* ***ўніверса́м*** → пасля галоснага ў пачатку запазычанага слова не пад націскам пішацца літара ***ў*** (нескладовае);<br>2) *цётка* ***Усціння*** → у пачатку ўласнай назвы пішацца літара ***У*** (складовае) і пасля галоснага;<br>3) ***поўны*** *рукзак* → слова, у якім адбылася замена зычнага гука [***л***] на зычны гук [***ў***] (параўнайце ў рускай мове: ***полный***);<br>4) *медыцынскі* ***сімпозіум*** → у запазычаным слове, якое заканчваецца на -***ум***, пішацца літара ***у*** (складовае);<br>5) *позні* ***ўсход*** → пасля слова, якое заканчваецца на галосны, пішацца літара ***ў*** (нескладовае) | Фанетыка і арфаэпія. Арфаграфія. Культура маўлення. Правапіс ***у–ў*** | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 2. Мінск: НІА, 2014; § 8.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 15 |

| Заданне. Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| **А5.** Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску трэба пісаць ***ь***:<br>1) печ_;<br>2) насып_;<br>3) рэл_еф;<br>4) подз_віг;<br>5) камен_чык.<br><br>**Адказ:** 3,5 | 1) *печ* → пасля зацвярдзелага зычнага [***ч***] *мяккі знак* не пішацца;<br>2) *насып* → пасля губнога зычнага [***п***] *мяккі знак* не пішацца;<br>3) *рэльеф* → у слове іншамоўнага паходжання пасля зычнага [***л'***] перад літарай ***е***, што абазначае два гукі [***йэ***], пішацца *раздзяляльны* ***ь***;<br>4) *подзвіг* → пасля зычнага [***дз'***] перад мяккім зычным [***в'***] *мяккі знак* не пішацца;<br>5) *камен**ь**чык* → у назоўніку, утваральная аснова якога заканчваецца на ***-нь*** (*камень*), перад памяншальна-ласкальным суфіксам ***-чык-*** пішацца *мяккі знак* | Фанетыка і арфаэпія. Арфаграфія. Культура маўлення. Правапіс мяккага знака | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 2. Мінск: НІА, 2014; §§ 5, 6.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 17 |
| **А6.** Адзначце правільна напісаныя словы:<br>1) падарожжа;<br>2) праграма;<br>3) бяспрэчны;<br>4) насценны;<br>5) наваколье.<br><br>**Адказ:** 1,2,4 | 1) *падаро**жж**а* → падаўжэнне зычнага гука [***ж***] у становішчы паміж галоснымі перадаецца падвоеным напісаннем адпаведнай літары (***жж***);<br>2) *прагра**м**а* → у слове іншамоўнага паходжання падаўжэнне зычных гукаў не адбываецца і пішацца адна літара ***м***;<br>3) *бя**сс**прэчны* → спалучэнне аднолькавых зычных гукаў на стыку прыстаўкі і кораня перадаецца падвоеным напісаннем адпаведнай літары (***сс***);<br>4) *насце**нн**ы* → спалучэнне аднолькавых зычных гукаў на стыку кораня і суфікса перадаецца падвоеным напісаннем адпаведнай літары (***нн***);<br>5) *навако**лл**е* → падаўжэнне зычнага гука [***л'***] у становішчы паміж галоснымі перадаецца падвоеным напісаннем адпаведнай літары (***лл***) | Фанетыка і арфаэпія. Арфаграфія. Культура маўлення. Падоўжаныя зычныя, іх правапіс | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 2. Мінск: НІА, 2014; § 9.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 15 |
| **А7.** Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску трэба пісаць літару ***с***:<br>1) ра_чэсваць;<br>2) _часце;<br>3) ка_ьба; | 1) *расчэсваць* → прыпадабненне свісцячага зычнага гука [***с***] пры вымаўленні да шыпячага зычнага [***ч***] на пісьме ў прыстаўцы ***рас-*** не перадаецца; вымаўляем: [*ра**шч**эсвац'*]; пішам: *ра**с**чэсваць*; | Фанетыка і арфаэпія. Арфаграфія. Культура маўлення. Зычныя гукі. Іх | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 2. Мінск: НІА, |



УДАРНЫ

| Заданне.<br>Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| 4) пагру_ка;<br>5) прагно_.<br><br>**Адказ:** 1,3 | 2) ***шч**асце* → слова пішацца адпаведна з літаратурным вымаўленнем: [***шч**ас’ц’э*];<br>3) *ка**с**ьба* → азванчэнне зычнага гука [***с’***] пры вымаўленні перад звонкім [***б***] на пісьме не перадаецца; вымаўляем: [*ка**з’**ба*]; правяраем: *ка**с**іць*; пішам: *ка**с**ьба*;<br>4) *пагру**з**ка* → аглушэнне пры вымаўленні ў сярэдзіне слова зычнага гука [***з***] перад глухім [***к***] на пісьме не перадаецца; вымаўляем: [*пагру**с**ка*]; правяраем: *пагру**з**іць*; пішам: *пагру**з**ка*;<br>5) *прагно**з*** → аглушэнне пры вымаўленні на канцы слова звонкага зычнага гука [***з***] на пісьме не перадаецца: вымаўляем – [*прагно**с***]; правяраем: *прагно**з**ы*; пішам: *прагно**з*** | вымаўленне і правапіс.<br>Вымаўленне і правапіс спалучэнняў зычных | 2014; §§ 1, 2.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; §§ 15, 16 |
| **А8.** Адзначце словы, якія ў сваім саставе маюць прыстаўку:<br>1) далікатна;<br>2) асвяжыць;<br>3) здольнасць;<br>4) вымаўленне;<br>5) прывабны.<br><br>**Адказ:** 2,4,5 | 1) *далікатна* → слова ў сваім саставе не мае прыстаўкі; аднакаранёвыя словы: *далікатны, далікатнасць*;<br>2) *асвяжыць* → слова ў сваім саставе мае прыстаўку ***а-***; аднакаранёвыя словы: *свежы, свежасць*;<br>3) *здольнасць* → слова ў сваім саставе не мае прыстаўкі; аднакаранёвае слова: *здольны*;<br>4) *вымаўленне* → слова ў сваім саставе мае прыстаўку ***вы-***; аднакаранёвыя словы: *маўленне*, *маўленчы*;<br>5) *прывабны* → слова ў сваім саставе мае прыстаўку ***пры-***; аднакаранёвыя словы: *вабіць, вабны* | Марфемная будова слова.<br>Словаўтварэнне і арфаграфія.<br>Культура маўлення.<br>Марфемы як структурна значымыя часткі слова | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 2. Мінск: НІА, 2014; §§ 24–26.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; §§ 23, 25 |
| **А9.** Адзначце словы, якія трэба пісаць праз злучок:<br>1) (матч) турнір;<br>2) (масла) завод;<br>3) (супер) лайнер;<br>4) (паў) апельсіна;<br>5) (Дунін) Марцінкевіч.<br><br>**Адказ:** 1,5 | 1) *матч-турнір* → складаны назоўнік, утвораны ад двух самастойных слоў ***матч*** і ***турнір*** без злучальнай галоснай, пішацца праз злучок;<br>2) *маслазавод* → складаны назоўнік, утвораны шляхам спалучэння дзвюх асноў ***масл-*** і ***завод-*** з дапамогай злучальнай галоснай ***а***, пішацца разам; | Марфалогія і арфаграфія.<br>Культура маўлення.<br>Складаныя назоўнікі, іх утварэнне і правапіс | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 2. Мінск: НІА, 2014; § 33.<br>**В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа |

| Заданне. Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| | 3) *суперлайнер* → складаны назоўнік з першай іншамоўнай часткай ***супер-*** пішацца разам;<br>4) *паўапельсіна* → частка ***паў-*** з агульным назоўнікам пішацца разам;<br>5) *Дунін-Марцінкевіч* → складаны назоўнік, які абазначае састаўное прозвішча, пішацца праз злучок | | установаў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 27.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа установаў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 19 |
| **А10.** Адзначце правільна напісаныя лічэбнікі:<br>1) пяцьдзясят;<br>2) семь;<br>3) дзвесце;<br>4) васьмёра;<br>5) шаснадцаты.<br><br>**Адказ:** 1,3,4 | 1) *пяцьдзясят* → лічэбнік напісаны правільна;<br>2) *сем* → пасля губнога гука [***м***] *мяккі знак* не пішацца;<br>3) *дзвесце* → лічэбнік напісаны правільна;<br>4) *васьмёра* → лічэбнік напісаны правільна;<br>5) *шаснаццаты* → у сярэдзіне лічэбніка ***шаснаццаты*** пішуцца дзве літары ***ц*** (***цц***) | Марфалогія і арфаграфія. Культура маўлення. Правапіс колькасных і парадкавых лічэбнікаў | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа установаў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 46, 47, 49.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа установаў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; §§ 33, 34 |
| **А11.** Адзначце словы, якія трэба пісаць праз злучок:<br>1) (добра) суседскі;<br>2) (дакументальна) мастацкі;<br>3) (сарака) тонны;<br>4) (архі) важны;<br>5) (паўночна) заходні.<br><br>**Адказ:** 2,5 | 1) *добрасуседскі* → складаны прыметнік, утвораны ад словазлучэння (***добры да суседзяў***), пішацца разам;<br>2) *дакументальна-мастацкі* → складаны прыметнік, утвораны ад двух раўназначных слоў (***дакументальны*** і ***мастацкі***), пішацца праз злучок;<br>3) *саракатонны* → складаны прыметнік, утвораны ад словазлучэння (***сорак тон***), пішацца разам;<br>4) *архіважны* → складаны прыметнік з першай іншамоўнай часткай ***архі-*** пішацца разам;<br>5) *паўночна-заходні* → складаны прыметнік, які абазначае напрамак свету, пішацца праз злучок | Марфалогія і арфаграфія. Культура маўлення. Правапіс складаных прыметнікаў | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа установаў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 2. Мінск: НІА, 2014; § 33.<br>**В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа установаў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 41.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа установаў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 19 |
| **А12.** Адзначце дзеясловы, якія ў форме 2-й асобы адзіночнага ліку цяперашняга ці будучага простага часу маюць канчатак ***-эш*** (***-еш***):<br>1) замаўчаць; | 1) *замаўчаць* – *замаўчыш* → дзеяслоў ІІ спражэння закончанага трывання ў форме 2-й асобы адзіночнага ліку будучага простага часу пасля асновы на зацвярдзелы зычны | Марфалогія і арфаграфія. Культура маўлення. Трыванне | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа установаў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання |

| Заданне. Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| 2) напомніць;<br>3) развязаць;<br>4) запрэгчы;<br>5) сумнявацца.<br><br>**Адказ:** 4,5 | гук мае канчатак -***ыш***;<br>2) *напомніць – напомніш* → дзеяслоў II спражэння закончанага трывання ў форме 2-й асобы адзіночнага ліку будучага простага часу пасля асновы на мяккі зычны гук мае канчатак -***іш***;<br>3) *развязаць – развя́жаш* → дзеяслоў I спражэння закончанага трывання ў форме 2-й асобы адзіночнага ліку будучага простага часу пасля асновы на зацвярдзелы зычны гук [***ж***] не пад націскам мае канчатак -***аш***;<br>4) *запрэгчы – запражэ́ш* → дзеяслоў I спражэння закончанага трывання ў форме 2-й асобы адзіночнага ліку будучага простага часу пасля асновы на зацвярдзелы зычны гук [***ж***] пад націскам мае канчатак -***эш***;<br>5) *сумнявацца – сумняваешся* → зваротны дзеяслоў I спражэння незакончанага трывання ў форме 2-й асобы адзіночнага ліку цяперашняга часу пасля асновы на мяккі зычны гук (*сумнява*[***йэ***]*шся*) мае канчатак -***еш***- (-***ся*** *– постфікс*) | дзеяслова. Утварэнне дзеясловаў закончанага і незакончанага трыванняў. Канчаткі дзеясловаў I і II спражэнняў, іх правапіс | ў дзвюх частках. Частка 1. Мінск: НІА, 2014; § 8.<br>**В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 61, 65.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; практ. 320; § 38 |
| **А13.** Адзначце прыклады, у якіх выдзеленыя словы трэба пісаць разам:<br>1) з'явіцца (***з***) ***нянацку***;<br>2) (***за***) ***летась*** наведвалі;<br>3) працаваць (***што***) ***дзень***;<br>4) быць (***на***) ***віду***;<br>5) гаварыць (***па***) ***французску***.<br><br>**Адказ:** 1,2,3 | 1) *з'явіцца* ***знянацку*** → прыслоўе, утворанае ад назоўніка, які ў сучаснай беларускай мове самастойна не ўжываецца, пішацца разам;<br>2) ***залетась*** *наведвалі* → прыслоўе, утворанае шляхам спалучэння прыслоўя ***летась*** і прыназоўніка ***за***, пішацца разам;<br>3) *працаваць* ***штодзень*** → прыслоўе, утворанае шляхам спалучэння займенніка ***што*** і назоўніка ***дзень***, пішацца разам;<br>4) *быць* ***на віду*** → блізкае да прыслоўя па значэнні і функцыі спалучэнне назоўніка з прыназоўнікам пішацца асобна;<br>5) *гаварыць* ***па-французску*** → прыслоўе, якое мае прыстаўку ***па-*** і заканчваецца на -***ску***, пішацца праз злучок | Марфалогія і арфаграфія. Культура маўлення. Правапіс прыслоўяў і спалучэнняў слоў, блізкіх да прыслоўяў | **Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 7 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 27–30.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; §§ 19, 43; практ. 344 |
| **А14.** Адзначце прыклады, у якіх часціцу ***не*** з | 1) ***не баяцца*** *марозу* → ***не*** з дзеясловам | Марфалогія і | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: |

| Заданне.<br>Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| выдзеленымі словамі трэба пісаць разам:<br>1) (***не***) ***баяцца*** марозу;<br>2) (***не***) ***чакаючы*** трамвая;<br>3) (***не***) ***пасаджаная*** цыбуля;<br>4) (***не***) ***пахісная*** воля;<br>5) дарогі (***не***) ***размыты***.<br><br>**Адказ:** 3,4 | пішацца асобна;<br>2) ***не чакаючы*** *трамвая* → ***не*** з дзеепрыслоўем пішацца асобна;<br>3) ***непасаджаная*** *цыбуля* → ***не*** з поўным дзеепрыметнікам, пры якім няма залежнага слова, пішацца разам;<br>4) ***непахісная*** *воля* → ***не-*** – прыстаўка, без якой слова ***непахісная*** не ўжываецца;<br>5) *дарогі* ***не размыты*** → ***не*** з кароткім дзеепрыметнікам пішацца асобна | арфаграфія.<br>Культура маўлення.<br>Правапіс часціцы ***не*** з рознымі часцінамі мовы | вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 42.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 7 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 12, 15, 47.<br>**З.І. Бадзевіч** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 8 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 5.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 48 |
| **А15.** Адзначце сказы, у якіх правільна ўжыта падкрэсленая часціца ***ні***:<br>1) Пражытае ***ні*** вымяраецца гада́мі, пражытае вымяраецца справамі.<br>2) У Беларусі кожны куточак, куды ты ***ні*** пойдзеш, пяе: звонкае слова, звонкая песня, звонкае сэрца яе!<br>3) Бывае і так, што летам зранку ***ні*** расінкі на траве і на галінках.<br>4) Ці ж ***ні*** лечыць нашы душы цудоўны свет прыроды!<br>5) Сваім бацькам за ўсё жыццё ***ні*** разу не схлусіў я.<br><br>**Адказ:** 2,3,5 | 1) *Пражытае* ***не*** *вымяраецца гада́мі, пражытае вымяраецца справамі.* → для надання адмоўнага значэння частцы сказа пры дзеяслове-выказніку ўжываецца часціца ***не***;<br>2) *У Беларусі кожны куточак, куды ты* ***ні*** *пойдзеш, пяе: звонкае слова, звонкая песня, звонкае сэрца яе!* → у дадзенай частцы *куды ты ні пойдзеш* для ўзмацнення сцвярджэння ўжываецца часціца ***ні***;<br>3) *Бывае і так, што летам зранку* ***ні*** *расінкі на траве і на галінках.* → для надання адмоўнага значэння дадзенай частцы *што летам зранку ні расінкі на траве і на галінках*, у якой няма дзейніка, ужываецца часціца ***ні***; часціца стаіць пры назоўніку ***расінкі*** ў форме роднага склону;<br>4) *Ці ж* ***не*** *лечыць нашы душы цудоўны свет прыроды!* → для надання сцвярджэння сказу пытальна-клічнага тыпу ўжываецца | Марфалогія і арфаграфія.<br>Культура маўлення.<br>Часціцы ***не*** і ***ні***, іх ужыванне і правапіс | **Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 7 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 46.<br>**З.І. Бадзевіч** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 8 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; практ. 23.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 47 |

| Заданне. Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| | часціца **не**;<br>5) *Сваім бацькам за ўсё жыццё **ні** разу не схлусіў я.* → у спалучэнні ***ні разу*** са значэннем *‘ніколі’* ўжываецца часціца ***ні*** | | |
| **А16.** Адзначце словазлучэнні, якія адпавядаюць нормам беларускай літаратурнай мовы:<br>1) ажаніцца з зямлячкай;<br>2) расці па лугам;<br>3) загадчык аддзелам;<br>4) прыязджаць у святы;<br>5) у двух кіламетрах ад горада.<br><br>**Адказ:** 1,4 | 1) *ажаніцца з зямлячкай* → дзеяслоў ***ажаніцца*** кіруе назоўнікам у форме творнага склону з прыназоўнікам ***з***;<br>2) *расці па лугах* → у форме множнага ліку меснага склону назоўнік з асновай на зычны гук [***г***] мае канчатак -***ах***;<br>3) *загадчык аддзела* → пры назоўніку ***загадчык*** залежнае слова ўжываецца ў форме роднага склону;<br>4) *прыязджаць у святы* → характэрная для беларускай мовы сінтаксічная канструкцыя;<br>5) *за два кіламетры ад горада* → характэрная для беларускай мовы сінтаксічная канструкцыя | Сінтаксіс і пунктуацыя.<br>Культура маўлення.<br>Словазлучэнне як сінтаксічная адзінка.<br>Асаблівасці кіравання ў беларускай мове | **З.І. Бадзевіч** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 8 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 8; практ. 55.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; практ. 277.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 9; С. 242–244 |
| **А17.** Адзначце сказы, у якіх выдзеленае (выдзеленыя) слова (словы) – ***акалічнасць***:<br>1) ***Каб*** сабраць ураджай, трэба ў падрыхтаваную зямлю своечасова кінуць зерне.<br>2) У небе ***ціха***: паляцелі ў далёкі вырай журавлі.<br>3) Чэрвень пчол выводзіць ***старанна*** на папас мядовы.<br>4) ***Зляцеўшы з клёна***, спусціўся на далонь маю ліст чырвоны.<br>5) Хадзілі мы некалі з бабуляй у лес, на луг, у поле ***збіраць*** зёлкі.<br><br>**Адказ:** 3,4,5 | 1) *Каб сабраць ураджай, трэба ў падрыхтаваную зямлю своечасова кінуць зерне.* → ***каб*** – падпарадкавальны злучнік, пры дапамозе якога ў складаназалежным сказе даданая акалічнасная частка мэты звязана з галоўнай часткай;<br>2) *У небе ціха: паляцелі ў далёкі вырай журавлі.* → у першай частцы бяззлучнікавага складанага сказа дзейніка няма; выказнік выражаны прыслоўем са значэннем стану ***ціха***;<br>3) *Чэрвень пчол выводзіць старанна на папас мядовы.* → прыслоўе ***старанна*** адносіцца да дзеяслова-выказніка ***выводзіць***, адказвае на пытанне *як?* і з’яўляецца акалічнасцю;<br>4) *Зляцеўшы з клёна, спусціўся на далонь маю ліст чырвоны.* → дзеепрыслоўны зварот з’яўляецца акалічнасцю; | Сінтаксіс і пунктуацыя.<br>Культура маўлення.<br>Галоўныя і даданыя члены сказа.<br>Спосабы выражэння галоўных і даданых членаў сказа | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 1. Мінск: НІА, 2014; § 17.<br>**В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 56.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 7 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 3, 16, 20, 42.<br>**З.І. Бадзевіч** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 8 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з |

УАДиКВ

| Заданне.<br>Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| | 5) *Хадзілі мы некалі з бабуляй у лес, на луг, у поле збіраць зёлкі.* → інфінітыў ***збіраць*** адносіцца да дзеяслова-выказніка ***хадзілі***, адказвае на пытанне *з якой мэтай?* і з’яўляецца акалічнасцю | | беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 19, 25 |
| **А18.** Адзначце аднасастаўныя сказы:<br>1) Учарашняга дня не вернеш.<br>2) Смачна спіцца на пахкім сене.<br>3) Лянівы сам сабе шкодзіць.<br>4) Праца – гэта добры сродак ад суму.<br>5) Восеньскі лес заўсёды шматфарбны.<br><br>**Адказ:** 1,2 | 1) *Учарашняга дня не вернеш.* → аднасастаўны сказ: дзейніка няма; выказнік выражаны дзеясловам у форме 2-й асобы адзіночнага ліку + часціца ***не***;<br>2) *Смачна спіцца на пахкім сене.* → аднасастаўны сказ: дзейніка няма; выказнік выражаны спалучэннем прыслоўя з безасабовым дзеясловам;<br>3) *Лянівы сам сабе шкодзіць.* → двухсастаўны сказ: дзейнік выражаны прыметнікам, ужытым у значэнні назоўніка; выказнік выражаны дзеясловам;<br>4) *Праца – гэта добры сродак ад суму.* → двухсастаўны сказ: дзейнік выражаны назоўнікам у форме назоўнага склону; выказнік выражаны назоўнікам у форме назоўнага склону + часціца ***гэта***;<br>5) *Восеньскі лес заўсёды шматфарбны.* → двухсастаўны сказ: дзейнік выражаны назоўнікам у форме назоўнага склону; у састаўным іменным выказніку дзеяслоў-звязка адсутнічае (нулявая звязка), іменная частка выражана прыметнікам | Сінтаксіс і пунктуацыя. Культура маўлення. Двухсастаўныя сказы. Аднасастаўныя сказы, іх будова | **З.І. Бадзевіч** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 8 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 15–19, 27–31.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 11 |
| **А19.** Адзначце сказы, у якіх працяжнік паміж дзейнікам і выказнікам пастаўлены ў адпаведнасці з правіламі пунктуацыі беларускай мовы:<br>1) Рыжая вавёрка – скок уніз.<br>2) Сонца – крыніца жыцця.<br>3) Хату будаваць – не байкі расказваць.<br>4) Возера Нарач за Свіцязь – глыбейшае.<br>5) Лес, безумоўна, – наша багацце.<br><br>**Адказ:** 1,2,3 | 1) *Рыжая вавёрка* **–** *скок уніз.* → паміж дзейнікам, выражаным назоўнікам у форме назоўнага склону, і выказнікам, выражаным усечанай формай дзеяслова, ***абавязкова*** ставіцца працяжнік;<br>2) *Сонца* **–** *крыніца жыцця.* → паміж дзейнікам і выказнікам, выражанымі назоўнікамі ў форме назоўнага склону, ***абавязкова*** ставіцца працяжнік;<br>3) *Хату будаваць* **–** *не байкі расказваць.* → | Сінтаксіс і пунктуацыя. Культура маўлення. Працяжнік паміж дзейнікам і выказнікам | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 1. Мінск: НІА, 2014; § 13.<br>**В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. |

| Заданне. Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| | паміж дзейнікам і выказнікам, выражанымі інфінітывамі, ***абавязкова*** ставіцца працяжнік;<br>4) *<u>Возера</u> Нарач за Свіцязь <u>глыбейшае</u>.* → паміж дзейнікам, выражаным назоўнікам у форме назоўнага склону, і выказнікам, выражаным прыметнікам у форме вышэйшай ступені параўнання, працяжнік ***не ставіцца***;<br>5) *<u>Лес</u>, безумоўна, наша <u>багацце</u>.* → паміж дзейнікам і выказнікам, выражанымі назоўнікамі ў форме назоўнага склону, ёсць пабочнае слова ***безумоўна***, таму працяжнік ***не ставіцца*** | | Мінск: НІА, 2015; § 12.<br>**З.І. Бадзевіч** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 8 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 21 |
| **А20.** Адзначце сказы, у якіх няма парушэння пунктуацыйных нормаў:<br>1) Чуваць у спевах салаўя цоканне, перабор, і пошчак, і цёхканне, і свіст.<br>2) Воблакі то шлейфам цягнуцца па небе, то коўдрай яго засцілаюць.<br>3) Духмяным, жытнім хлебам прыходзіць спелы колас на наш стол.<br>4) Непаўторныя па сваёй красе беларускія дубровы, ды гаі.<br>5) Мароз па вуліцах ходзіць і снегам хрусціць, вятры з сабой водзіць і ў дрэвах трашчыць.<br><br>**Адказ:** 1,2,5 | 1) *Чуваць у спевах салаўя <u>цоканне</u>, <u>перабор</u>, і <u>пошчак</u>, і <u>цёхканне</u>, і <u>свіст</u>.* → коскамі раздзяляюцца аднародныя дзейнікі, звязаныя паўторным спалучальным злучнікам ***і***;<br>2) *Воблакі то шлейфам <u>цягнуцца</u> па небе, то коўдрай яго <u>засцілаюць</u>.* → паміж аднароднымі выказнікамі, звязанымі пры дапамозе размеркавальнага злучніка ***то*** – ***то***, ставіцца коска;<br>3) *<u>Духмяным</u> <u>жытнім</u> хлебам прыходзіць спелы колас на наш стол.* → паміж неаднароднымі азначэннямі, выражанымі якасным прыметнікам ***духмяным*** і адносным прыметнікам ***жытнім***, коска не ставіцца;<br>4) *Непаўторныя па сваёй красе беларускія <u>дубровы</u> ды <u>гаі</u>.* → паміж аднароднымі дзейнікамі, звязанымі пры дапамозе адзіночнага спалучальнага злучніка ***ды*** (= ***і***), коска не ставіцца;<br>5) *Мароз па вуліцах <u>ходзіць</u> і снегам <u>хрусціць</u>, вятры з сабой <u>водзіць</u> і ў дрэвах <u>трашчыць</u>.* → аднародныя выказнікі, звязаныя парамі пры дапамозе злучнікаў ***і***, | Сінтаксіс і пунктуацыя. Культура маўлення. Знакі прыпынку пры аднародных членах сказа | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 1. Мінск: НІА, 2014; § 19.<br>**З.І. Бадзевіч** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 8 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 37–40.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 12; практ. 99, 100, 104 |

УАЯРКВ

| Заданне. Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| | коскамі не раздзяляюцца; пары аднародных выказнікаў, звязаныя бяззлучнікавай сувяззю, раздзяляюцца коскамі | | |
| **А21.** Адзначце сказы, у якіх на месцы пропуску (пропускаў) трэба паставіць коску (коскі):<br>1) У маі толькі пацяплее – усё__ як бачыш__ зелянее.<br>2) Гаючая, жыватворная__ нібы крынічная вада__ для нас ты, матчына мова!<br>3) Соф'я Кавалеўская, якую мы ведаем__ як першую ў свеце жанчыну-прафесара, паходзіць са шляхецкага беларускага роду.<br>4) Вясною сонейка вяснушкамі__ быццам залацінкамі__ ўпрыгожвае дзіцячыя насы.<br>5) Чароўна выглядаюць чарэшні, калі на іх паяўляюцца незвычайныя__ што букецікі нявесты__ сунецы.<br><br>**Адказ:** 2,4,5 | 1) *У маі толькі пацяплее – усё як бачыш зелянее.* → не выдзяляецца коскамі фразеалагізм ***як бачыш***;<br>2) *Гаючая, жыватворная, нібы крынічная вада, для нас ты, матчына мова!* → выдзяляецца коскамі параўнальны зварот ***нібы крынічная вада***; ***нібы*** – параўнальны злучнік;<br>3) *Соф'я Кавалеўская, якую мы ведаем як першую ў свеце жанчыну-прафесара, паходзіць са шляхецкага беларускага роду.* → не аддзяляецца коскай зварот ***як першую ў свеце жанчыну-прафесара***, які мае значэнне *'ў якасці'* (*Соф'я Кавалеўская* і ёсць *першая ў свеце жанчына-прафесар*);<br>4) *Вясною сонейка вяснушкамі, быццам залацінкамі, упрыгожвае дзіцячыя насы.* → выдзяляецца коскамі параўнальны зварот ***быццам залацінкамі***; ***быццам*** – параўнальны злучнік;<br>5) *Чароўна выглядаюць чарэшні, калі на іх паяўляюцца незвычайныя, што букецікі нявесты, сунецы.* → выдзяляецца коскамі параўнальны зварот ***што букецікі нявесты***; ***што*** – параўнальны злучнік | Сінтаксіс і пунктуацыя. Культура маўлення. Знакі прыпынку ў сказах з параўнальнымі зваротамі | **З.І. Бадзевіч** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 8 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 52, 53.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 15 |
| **А22.** Адзначце сказы, у якіх на месцы пропуску (пропускаў) трэба паставіць коску (коскі):<br>1) Каб подых вясновы адчуць, стаю я на ганку__ стаіўшы дыханне.<br>2) Апранутая ў чорную світку__ ўважліва сачыла за мітуслівымі вераб'ямі варона.<br>3) Звязваючы з яварам свае спадзяванні на лепшы лёс__ нашы продкі выконвалі побач з ім найважнейшыя каляндарныя і сямейныя абрады.<br>4) Сухацвет__ ці бяссмертнік__ усё лета жаўцее | 1) *Каб подых вясновы адчуць, стаю я на ганку стаіўшы дыханне.* → коскай не аддзяляецца акалічнасць ***стаіўшы дыханне***, якая з'яўляецца фразеалагізмам;<br>2) *Апранутая ў чорную світку, уважліва сачыла за мітуслівымі вераб'ямі варона.* → коскай аддзяляецца адасобленае дапасаванае азначэнне ***Апранутая ў чорную світку***, якое стаіць перад паясненым назоўнікам ***варона*** і аддзелена ад яго іншымі членамі сказа; | Сінтаксіс і пунктуацыя. Культура маўлення. Знакі прыпынку пры адасобленых членах сказа | **Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 7 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 7, 16.<br>**З.І. Бадзевіч** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 8 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 46–50.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: |

| Заданне.<br>Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў.<br>Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| на адкрытых пясчаных мясцінах.<br>5) Найбольшую славу прыватнай друкарні Марціна Кухты прынёс__ выдадзены ў 1913 годзе__ зборнік Максіма Багдановіча «Вянок».<br><br>**Адказ:** 2,3,4 | 3) *Звязваючы з яварам свае спадзяванні на лепшы лёс, нашы продкі выконвалі побач з ім найважнейшыя каляндарныя і сямейныя абрады.* → аддзяляецца коскай адасобленая акалічнасць ***Звязваючы з яварам свае спадзяванні на лепшы лёс***, выражаная дзеепрыслоўным зваротам;<br>4) *Сухацвет, ці бяссмертнік, усё лета жаўцее на адкрытых пясчаных мясцінах.* → выдзяляецца коскамі адасоблены прыдатак ***ці бяссмертнік***, пры якім ёсць злучнік ***ці*** і які мае ўдакладняльнае значэнне;<br>5) *Найбольшую славу прыватнай друкарні Марціна Кухты прынёс выдадзены ў 1913 годзе зборнік Максіма Багдановіча «Вянок».* → не выдзяляецца коскамі дапасаванае азначэнне ***выдадзены ў 1913 годзе***, якое выражана дзеепрыметнікавым зваротам і стаіць перад паяснёным назоўнікам ***зборнік*** | | вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 13 |
| **А23.** Адзначце сказы, у якіх на месцы пропуску (пропускаў) трэба паставіць коску (коскі):<br>1) Бярозавыя лясы__ вядома__ самыя маладыя: іх сярэдні ўзрост – 35–40 гадоў.<br>2) У рабоце, у клопатах ніхто__ амаль__ не заўважае, як лета мінае, пераходзіць у восень.<br>3) Кожны__ на маю думку__ сам каваль свайго лёсу.<br>4) Нота «ля» належыць салаўю, аднак__ нота «сі» належыць жаўруку – самародку-спеваку.<br>5) Найбольш важным__ кажуць людзі__ з'яўляецца тое, хто ты ёсць, а не тое, за каго цябе прымаюць.<br><br>**Адказ:** 1,3,5 | 1) *Бярозавыя лясы, вядома, самыя маладыя: іх сярэдні ўзрост – 35–40 гадоў.* → слова ***вядома***, якое граматычна не звязана з іншымі словамі ў сказе, указвае на большую ступень упэўненасці ў паведамленні, з'яўляецца пабочным; пабочнае слова выдзяляецца коскамі;<br>2) *У рабоце, у клопатах ніхто амаль не заўважае, як лета мінае, пераходзіць у восень.* → часціца ***амаль*** коскамі не выдзяляецца;<br>3) *Кожны, на маю думку, сам каваль свайго лёсу.* → словазлучэнне ***на маю думку***, якое граматычна не звязана з іншымі словамі ў сказе, указвае на крыніцу паведамлення, з'яўляецца пабочным; пабочнае словазлучэнне выдзяляецца коскамі;<br>4) *Нота «ля» належыць салаўю, аднак нота* | Сінтаксіс і пунктуацыя. Культура маўлення. Знакі прыпынку ў сказах з пабочнымі канструкцыямі | **З.І. Бадзевіч** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 8 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 44.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 14 |

| Заданне. Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| | *«сі» належыць жаўруку – самародку-спеваку.* → не аддзяляецца коскай супраціўны злучнік ***аднак***;<br>5) *Найбольш важным**,** кажуць людзі**,** з'яўляецца тое, хто ты ёсць, а не тое, за каго цябе прымаюць.* → сказ ***кажуць людзі***, які граматычна не звязаны з членамі сказа, не дзеліцца па членах сказа і ўказвае на крыніцу паведамлення, з'яўляецца пабочным; пабочны сказ выдзяляецца коскамі | | |
| **А24.** Адзначце складаназлучаныя сказы, паміж часткамі якіх трэба паставіць коску:<br>1) Патыхала ад рыбацкага вогнішча юшкай а ветрык у затоках лілеі крамяныя гушкаў.<br>2) Грэчаскі вучоны Анаксімандр быў першым складальнікам геаграфічнай карты і ён жа першы вызначыў стораны гарызонту.<br>3) Дождж прайшоў і ўсе грыбы напіліся ўсмак вады.<br>4) Горкая часам праца затое хлеб ад яе салодкі.<br>5) Сягоння і пасля няхай неба будзе чыстым і будзе квітнець Зямля.<br><br>**Адказ:** 1,2,4 | 1) *Патыхала ад рыбацкага вогнішча юшкай**,** а ветрык у затоках лілеі крамяныя гушкаў.* → паміж часткамі складаназлучанага сказа з супастаўляльнымі сэнсавымі адносінамі перад супраціўным злучнікам ***а*** ставіцца коска;<br>2) *Грэчаскі вучоны Анаксімандр быў першым складальнікам геаграфічнай карты**,** і ён жа першы вызначыў стораны гарызонту.* → паміж часткамі складаназлучанага сказа са спалучальнымі сэнсавымі адносінамі перад адзіночным спалучальным злучнікам ***і*** ставіцца коска;<br>3) *Дождж прайшоў **–** і ўсе грыбы напіліся ўсмак вады.* → паміж часткамі складаназлучанага сказа, звязанымі спалучальным злучнікам ***і***, ставіцца працяжнік, бо другая частка сказа змяшчае вынік таго, пра што гаворыцца ў першай;<br>4) *Горкая часам праца**,** затое хлеб ад яе салодкі.* → паміж часткамі складаназлучанага сказа з супастаўляльнымі сэнсавымі адносінамі перад супраціўным злучнікам ***затое*** ставіцца коска;<br>5) *Сягоння і пасля няхай неба будзе чыстым і будзе квітнець Зямля.* → паміж часткамі складаназлучанага сказа са спалучальнымі сэнсавымі адносінамі перад адзіночным спалучальным злучнікам ***і*** коска не ставіцца, | Сінтаксіс і пунктуацыя. Культура маўлення. Знакі прыпынку паміж часткамі ў складаназлучаных сказах | **Н.М. Гардзей** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 9 класа агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2011; §§ 6–11.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 16 |

| Заданне.<br>Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў.<br>Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| | бо ў першай частцы ёсць агульныя для абедзвюх частак словы ***Сягоння і пасля няхай*** | | |
| **А25.** Адзначце складаназалежныя сказы, у якіх няма парушэння пунктуацыйных нормаў:<br>1) Прыляцела ластаўка і прашчабятала вестачку, што вясна ідзе, і што з сабой яна цяпло нясе.<br>2) Кажуць, што, калі капейкі не беражэш, то і рубля не будзеш мець.<br>3) У небе блакітным, дзе аблокі купаюцца птушыныя вольныя песні разліваюцца.<br>4) Хоць варона пер'е і вымыла, бялейшай ад гэтага не стала.<br>5) Ураджай збярэш, калі добра зямлю ўзарэш.<br><br>**Адказ:** 4,5 | 1) *Прыляцела ластаўка і прашчабятала вестачку, што вясна ідзе і што з сабой яна цяпло нясе.* → сказ з дзвюма даданымі азначальнымі часткамі, якія паясняюць у галоўнай дапаўненне ***вестачку***, адказваюць на адно і тое ж пытанне *якую?* і з'яўляюцца аднароднымі; паміж аднароднымі даданымі часткамі, звязанымі адзіночным спалучальным злучнікам ***і***, коска не ставіцца;<br>2) *Кажуць, што калі капейкі не беражэш, то і рубля не будзеш мець.* → складаназалежны сказ з дзвюма даданымі часткамі, дзе паміж падпарадкавальнымі злучнікамі ***што*** і ***калі***, якія стаяць побач, коска не ставіцца, бо ёсць другая частка ***то*** парнага злучніка ***калі – то***;<br>3) *У небе блакітным, дзе аблокі купаюцца**,** птушыныя вольныя песні разліваюцца.* → складаназалежны сказ, у якім даданая азначальныя частка, што звязана з галоўнай пры дапамозе злучальнага слова ***дзе***, выдзяляецца коскамі;<br>4) *Хоць варона пер'е і вымыла, бялейшай ад гэтага не стала.* → складаназалежны сказ, у якім даданая акалічнасная частка, што звязана з галоўнай пры дапамозе падпарадкавальнага злучніка ***хоць***, аддзяляецца коскай;<br>5) *Ураджай збярэш, калі добра зямлю ўзарэш.* → складаназалежны сказ, у якім даданая акалічнасная частка, што звязана з галоўнай пры дапамозе падпарадкавальнага злучніка ***калі***, аддзяляецца коскай | Сінтаксіс і пунктуацыя. Культура маўлення. Знакі прыпынку паміж часткамі ў складаназалежных сказах | **Н.М. Гардзей** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 9 класа агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2011; §§ 13–21, 23, 24.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 17 |
| **А26.** Адзначце бяззлучнікавыя складаныя сказы, паміж часткамі якіх трэба паставіць двукроп'е:<br>1) Заўважыў правільна народ не хлебам адзіным | 1) *Заўважыў правільна народ**:** не хлебам адзіным жыве чалавек.* → паміж дзвюма часткамі бяззлучнікавага складанага сказа | Сінтаксіс і пунктуацыя. Культура маўлення. | **Н.М. Гардзей** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 9 класа агульнаадукацыйных устаноў з |

| Заданне. Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| жыве чалавек.<br>2) Вясну хваляць за дажджы лета хваляць за снапы.<br>3) Нездарма Беларусь называюць сінявокай адметнай рысай прыроды Беларусі з'яўляецца вялікая колькасць азёр.<br>4) Лета праляжыш зімой з торбай бегаць давядзецца.<br>5) Сакавік прыйшоў пад серабрысты шум ручаёў сакавік душу ўлагодзіў несціханым свістам шпакоў.<br><br>**Адказ:** 1,3 | ставіцца двукроп'е, бо другая частка раскрывае, удакладняе змест першай; паміж часткамі можна ўставіць злучнік ***што***;<br>2) *Вясну хваляць за дажджы* **–** *лета хваляць за снапы.* → паміж дзвюма часткамі бяззлучнікавага складанага сказа ставіцца працяжнік, бо іх змест супастаўляецца; паміж часткамі можна ўставіць супраціўны злучнік ***а***;<br>3) *Нездарма Беларусь называюць сінявокай****:*** *адметнай рысай прыроды Беларусі з'яўляецца вялікая колькасць азёр.* → паміж дзвюма часткамі бяззлучнікавага складанага сказа ставіцца двукроп'е, бо ў другой частцы ўказваецца прычына таго, пра што гаворыцца ў першай; паміж часткамі можна ўставіць злучнікі ***бо***, ***таму што***;<br>4) *Лета праляжыш* **–** *зімой з торбай бегаць давядзецца.* → паміж дзвюма часткамі бяззлучнікавага складанага сказа ставіцца працяжнік, бо першая частка паказвае на ўмову таго, пра што гаворыцца ў другой частцы; у пачатку першай часткі можна паставіць злучнік ***калі***;<br>5) *Сакавік прыйшоў пад серабрысты шум ручаёў****,*** *сакавік душу ўлагодзіў несціханым свістам шпакоў.* → паміж дзвюма часткамі бяззлучнікавага складанага сказа ставіцца коска, бо ў іх выражаюцца адносіны адначасовасці з'яў; паміж часткамі можна ўставіць спалучальныя злучнікі ***і***, ***ды*** (= ***і***) | Знакі прыпынку паміж часткамі ў бяззлучнікавых складаных сказах | беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2011; §§ 26–29.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 18 |

| Заданне. Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| **А27.** Адзначце сцверджанні, якія адпавядаюць складанаму сказу з рознымі відамі сувязі частак:<br><br>*Трэба нам, лічу, кожнай вясной садзіць сады і кветкі Зямля якую мы атрымалі ў спадчыну і якую перададзім нашым нашчадкам павінна заставацца зялёнай і расквечанай.*<br><br>1) у сказе прапушчана двукроп’е;<br>2) у сказе пастаўлены ўсе неабходныя знакі прыпынку;<br>3) у сказе прапушчаны тры коскі;<br>4) у сказе прапушчаны працяжнік;<br>5) у сказе прапушчаны дзве коскі.<br><br>**Адказ:** 1,5 | **І** [1]*Трэба нам, лічу, кожнай вясной садзіць сады і кветкі*: **ІІ** [2]*Зямля,* [3]*якую мы атрымалі ў спадчыну і* [4]*якую перададзім нашым нашчадкам,* [2]*павінна заставацца зялёнай і расквечанай.* → сказу адпавядаюць наступныя сцверджанні:<br>1) сцверджанне пад нумарам **1**: паміж **І** і **ІІ** сэнсавымі часткамі ставіцца двукроп’е, бо яны звязаны бяззлучнікавай сувяззю і ў **ІІ** частцы ўказваецца прычына таго, пра што гаворыцца ў **І**; паміж часткамі можна ўставіць злучнікі ***бо***, ***таму што***;<br>2) сцверджанне пад нумарам **5**: у **ІІ** сэнсавай частцы аднародныя даданыя часткі **3** і **4**, якія стаяць у сярэдзіне галоўнай **2**, выдзяляюцца з двух бакоў коскамі.<br>Паміж аднароднымі даданымі часткамі **3** і **4**, звязанымі спалучальным злучнікам ***і***, коска не ставіцца | Сінтаксіс і пунктуацыя. Культура маўлення. Знакі прыпынку паміж часткамі ў складаных сказах з рознымі відамі сувязі частак | **Н.М. Гардзей** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 9 класа агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2011; §§ 31, 32.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 19 |
| **А28.** Адзначце знак (знакі) прыпынку, які (якія) трэба паставіць на месцы пропуску ў сказе:<br><br>*Сёння добра разумею словы, якія любіў паўтараць мой дзядуля__ «Можна і самому сябе хваліць, унучак, але ўласная пахвала мала чаго вартая».*<br><br>1) кропку і працяжнік;<br>2) коску і працяжнік;<br>3) працяжнік;<br>4) двукроп’е;<br>5) кропку.<br><br>**Адказ:** 4 | *Сёння добра разумею словы, якія любіў паўтараць мой дзядуля*: *«Можна і самому сябе хваліць, унучак, але ўласная пахвала мала чаго вартая».* → сказ з простай мовай, у якім:<br>1) словы аўтара стаяць перад простай мовай; пасля слоў аўтара трэба паставіць *двукроп’е* | Сінтаксіс і пунктуацыя. Культура маўлення. Знакі прыпынку ў сказах з простай мовай | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 1. Мінск: НІА, 2014; § 23.<br>**Н.М. Гардзей** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 9 класа агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2011; §§ 35, 36.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 21 |

<table>
<tr><th>Заданне.<br>Адказ</th><th>Разбор задання</th><th>Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу</th><th>Вучэбны дапаможнік</th></tr>
<tr><td colspan="4">Тэкст да заданняў А29, А30, В1–В6<br>(1) «Дзянёк сёння будзе як на заказ. Айда, Васілёк, у лес! Можа, грыбоў напалюем?» – сказаў Антон, разбудзіўшы ўнука на досвітку ў нядзельку.<br>(2) У лесе ўжо рашуча распараджалася восень. (3) Восень [1]смела [2]гаспадарыла ўсюды, але ў лесе [3]яе [4]работа [5]здавалася найбольш <u>значнай</u> і чароўнай.<br>(4) Па загадзе восені-чараўніцы вясёлы, гарэзлівы ветрык раскалашмаціў косы бярозкам. (5) А <u>сама</u> гаспадыня дакранулася да залатой фарбы і дзе акрапіла бярозавыя лісточкі, а дзе правяла па іх (праўда, не поўнасцю, а толькі па самым краі) тонкім залатым шнурочкам. (6) Не пашкадавала і рассыпала сонечныя залацінкі па лісці таполяў, ясеняў, дадаўшы крышку чырвані. (7) Лёгкім, нячутным крокам прайшлася каля явара. (8) Прыхінула да сябе яго галінкі, … пагладзіла ды адпусціла. (9) І стаў явар барвовы, нібы нечага засаромеўся. (10) Клёны, вакол якіх кружылася, вілася восень не адзін дзень, былі непадобныя адзін да аднаго: некаторыя мелі лімонна-жоўты колер, іншыя – чырванаватыя.<br>(11) – Скажы, восенню <u>лес</u> слаўны? – звярнуўся да ўнука дзядуля.<br>(12) – Ага! – азваўся Васілёк і раптам ускрыкнуў: – Эх, дрэнны з цябе грыбнік, дзядуля! Баравікоў побач з сабою не бачыш!<br>(13) – Цэлая сямейка! Кладзі хутчэй у кошык! – абрадаваўся Антон і дадаў: – Цяпер мая чарга хоць адзін баравік <u>адшукаць</u>.</td></tr>
<tr><td>А29. Адзначце правільнае сцверджанне ў дачыненні да тэксту:<br>1) тэкст гутарковага стылю;<br>2) тэкст мастацкага стылю;<br>3) тэкст навуковага стылю;<br>4) тэкст публіцыстычнага стылю;<br>5) тэкст афіцыйнага стылю.<br><br>Адказ: 2</td><td>тэксту адпавядае сцверджанне пад нумарам 2: тэкст мастацкага стылю, таму што:<br>1) уяўляе сабой свабоднае, натуральна арганізаванае маўленне, якое характэрна для мастацкіх твораў розных жанраў: раман, аповесць, апавяданне;<br>2) яго галоўная асаблівасць – адзінства рэалізацыі камунікатыўнай і эстэтычнай функцый: словы не толькі перадаюць пэўны змест, але і, з’яўляючыся сродкам фарміравання мастацкіх вобразаў, уздзейнічаюць на думкі і пачуцці чытача;<br>3) эмацыянальнасць, вобразнасць, яркасць тэксту надаюць вобразна-выяўленчыя сродкі: эпітэты (вясёлы, гарэзлівы ветрык; сонечныя залацінкі; лёгкім, нячутным крокам; лес слаўны); метафары (распараджалася восень; восень гаспадарыла; ветрык раскалашмаціў косы; восень (гаспадыня) дакранулася да фарбы, акрапіла лісточкі; прайшлася каля явара, прыхінула да яго свае галінкі, пагладзіла ды адпусціла; кружылася, вілася восень); параўнанне (стаў явар барвовы, нібы нечага засаромеўся); словы з</td><td>Маўленне. Тэкст. Стылістыка. Функцыянальныя стылі маўлення</td><td>В.П. Красней і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 1. Мінск: НІА, 2014; § 11.<br>В.П. Красней і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 2. Мінск: НІА, 2014; § 11.<br>В.П. Красней і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 13, 57.<br>Г.М. Валочка і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 7 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 2.<br>З.І. Бадзевіч і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 8 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 3, 10, 11, 33.</td></tr>
</table>

| Заданне. Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| | памяншальна-ласкальным значэннем (*дзянёк*, *Васілёк*, *ветрык*, *бярозка*, *залацінкі*); фразеалагізм (дзянёк будзе *як на заказ*); сказы з простай мовай (*– Скажы, восенню* ***<u>лес</u>*** *слаўны? – звярнуўся да ўнука дзядуля.*; *– Ага! – азваўся Васілёк і раптам ускрыкнуў: – Эх, дрэнны з цябе грыбнік, дзядуля! Баравікоў побач з сабою не бачыш!*; *– Цэлая сямейка! Кладзі хутчэй у кошык! – абрадаваўся Антон і дадаў: – Цяпер мая чарга хоць адзін баравік* ***<u>адшукаць</u>***.) | | **Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; §§ 4–8 |
| **А30.** Адзначце словы, якія могуць быць ужыты на месцы пропуску ў ***8-м*** сказе тэксту:<br>1) сардэчна;<br>2) станоўча;<br>3) пяшчотна;<br>4) лагодна;<br>5) плённа.<br><br>**Адказ:** 3,4 | на месцы пропуску ў ***8-м*** сказе тэксту могуць быць ужыты словы-сінонімы ***пяшчотна*** і ***лагодна***:<br>1) *пяшчотна*: (8) *Прыхінула да сябе яго галінкі, пяшчотна пагладзіла ды адпусціла.*;<br>2) *лагодна*: (8) *Прыхінула да сябе яго галінкі, лагодна пагладзіла ды адпусціла.* | Маўленне. Тэкст. Стылістыка. Прыметы тэксту: сэнсавая цэласнасць, тэматычнае адзінства, разгорнутасць, паслядоўнасць, звязнасць, завершанасць тэксту | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 2. Мінск: НІА, 2014; § 16.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 7 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 2.<br>**З.І. Бадзевіч** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 8 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 2, 26.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; §§ 9, 21.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. |

УА "РІКВ"

| Заданне.<br>Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў.<br>Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| | | | Мінск: НІА, 2016; § 2 |
| **В1.** З пранумараваных у ***3-м*** сказе тэксту слоў вызначце тое, у якім ёсць асіміляцыя зычных гукаў. Запішыце гэта слова так, як яно пададзена ў ***3-м*** сказе.<br><br>**Адказ:** смела | 1) *смела* → цвёрды свісцячы зычны гук [***с***] прыпадабняецца да мяккага зычнага [***м’***] і вымаўляецца як мяккі [***с’***]: [***с’м’эла***];<br>2) прыпадабненне цвёрдага зычнага гука да мяккага зычнага называецца асіміляцыяй зычных гукаў па мяккасці | Фанетыка і арфаэпія. Арфаграфія. Культура маўлення. Арфаэпічныя нормы: нормы беларускага літаратурнага вымаўлення | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 2. Мінск: НІА, 2014; § 3.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 13 |
| **В2.** Запішыце падкрэслены ў ***11-м*** сказе тэксту назоўнік у форме роднага склону адзіночнага ліку.<br><br>**Адказ:** лесу | 1) *лесу* → зборны назоўнік 2-га скланення мужчынскага роду ***лес*** у форме роднага склону адзіночнага ліку мае канчатак -***у*** | Марфалогія і арфаграфія. Культура маўлення. Назоўнікі 2-га скланення, правапіс іх склонавых канчаткаў | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 18.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 29 |
| **В3.** Запішыце падкрэслены ў ***3-м*** сказе тэксту прыметнік у форме назоўнага склону множнага ліку.<br><br>**Адказ:** значныя | 1) *значныя* → прыметнік з асновай на цвёрды зычны гук у форме назоўнага склону множнага ліку мае канчатак -***ыя*** | Марфалогія і арфаграфія. Культура маўлення. Скланенне якасных прыметнікаў | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 35.<br>**.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 32 |
| **В4.** Запішыце падкрэслены ў ***5-м*** сказе тэксту займеннік у форме давальнага склону адзіночнага ліку.<br><br>**Адказ:** самой | 1) *самой* → пры скланенні азначальнага займенніка ***самá*** націск падае на канчатак: ***самóй*** | Марфалогія і арфаграфія. Культура маўлення. Скланенне і правапіс займеннікаў | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 53.<br>**.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: |

| **Заданне. Адказ** | **Разбор задання** | **Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу** | **Вучэбны дапаможнік** |
|---|---|---|---|
| | | | вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 36 |
| **В5.** Ад асновы дзеяслова, падкрэсленага ў ***13-м*** сказе тэксту, утварыце поўны дзеепрыметнік і запішыце яго ў форме назоўнага склону адзіночнага ліку мужчынскага роду.<br><br>**Адказ:** адшуканы | 1) *адшуканы* → ад асновы неазначальнай формы дзеяслова закончанага трывання ***адшукаць*** з дапамогай суфікса ***-н-*** утвараецца поўны дзеепрыметнік залежнага стану прошлага часу ***адшуканы*** | Марфалогія і арфаграфія. Культура маўлення. Дзеепрыметнікі незалежнага і залежнага стану, іх утварэнне і правапіс | **Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 7 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 8, 9.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 40 |
| **В6.** У адным са сказаў ***9–13*** тэксту знайдзіце слова, якое мае значэнне ‘***харошы, які дае радасць***’. Запішыце гэта слова ў той граматычнай форме, у якой яно пададзена ў адным са сказаў ***9–13***.<br><br>**Адказ:** слаўны | 1) *слаўны* → лексічнае значэнне ‘*харошы, які дае радасць*’ мае ўжытае ў ***11-м*** сказе тэксту слова ***слаўны*** | Лексіка. Фразеалогія. Культура маўлення. Слова, яго лексічнае значэнне | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 2. Мінск: НІА, 2014; § 13.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 20 |
| **В7.** Знайдзіце ў прапанаваным сказе немэтазгодна (збыткоўна) выкарыстанае слова, якое парушае правільнасць маўлення. Запішыце гэта слова ў той граматычнай форме, у якой яно пададзена ў сказе:<br><br>*Янка Купала быў першы, хто разгадаў у Максіме Багдановічу выдатнага паэта, таленавітага генія літаратуры.*<br><br>**Адказ:** таленавітага | 1) *таленавітага* → ужытае ў сказе слова ***геній*** (*генія*) мае значэнне ‘*самая высокая ступень таленавітасці чалавека ў якой-небудзь сферы дзейнасці*’, таму слова ***таленавітага*** ў прапанаваным сказе збыткоўнае | Маўленне. Тэкст. Стылістыка. Нормы сучаснай беларускай літаратурнай мовы | **Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 7 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 1.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 2 |



УА "РІКВ"

| Заданне. Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|

**B8.** Устанавіце адпаведнасць паміж фразеалагізмамі ў левым слупку і ***супрацьлеглымі*** ім па значэнні фразеалагізмамі ў правым слупку. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца ўвогуле. Напрыклад: А2Б5В3Г4.

| | |
|---|---|
| **А.** Аршын з шапкай.<br>**Б.** Малая сошка.<br>**В.** Жаўтаротае птушаня.<br>**Г.** Сёмая вада на кісялі. | **1.** Крукам носа не дастаць.<br>**2.** Свая кроў.<br>**3.** Птушка высокага палёту.<br>**4.** З каломенскую вярсту.<br>**5.** Стары верабей. |

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Адказ:** А4Б3В5Г2 | 1) *аршын з шапкай* – ‘вельмі малы, невысокі, нізкарослы’ → *з каломенскую вярсту* – ‘вельмі высокі’;<br>2) *малая сошка* – ‘нязначны, неўплывовы чалавек’ → *птушка высокага палёту* – ‘чалавек, які займае высокае становішча ў грамадстве’;<br>3) *жаўтаротае птушаня* – ‘вельмі малады, нявопытны, наіўны чалавек’ → *стары верабей* – ‘вельмі вопытны, спрактыкаваны чалавек’;<br>4) *сёмая вада на кісялі* – ‘вельмі далёкі сваяк’ → *свая кроў* – ‘блізкі сваяк’ | Лексіка. Фразеалогія. Культура маўлення. Фразеалагізмы, іх роля ў маўленні | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 2. Мінск: НІА, 2014; § 22.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; § 22 |

**B9.** Вызначце, якімі часцінамі мовы з’яўляюцца падкрэсленыя ў сказах словы, і ўстанавіце адпаведнасць паміж слупкамі табліцы. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца ўвогуле. Напрыклад: А2Б5В3Г4.

| | |
|---|---|
| **А.** Правіла ***гэта*** ўсім вядомае: дружыць з галоснымі «ў нескладовае».<br>**Б.** Дзе начуе жаўранак, скажыце: на лёгкім воблаку ***або*** ў жыце?<br>**В.** Добра жыць ***сярод*** людзей, у якіх ёсць чаму павучыцца.<br>**Г.** ***Ці*** ж можна, працы не любячы, чалавекам стаць? | **1.** Злучнік.<br>**2.** Займеннік.<br>**3.** Часціца.<br>**4.** Прыслоўе.<br>**5.** Прыназоўнік. |

| Заданне.<br>Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў.<br>Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| **Адказ:** А2Б1В5Г3 | 1) *гэта* → ***указальны займеннік***, які паказвае на прадмет (***правіла***), што вылучаецца з ліку іншых;<br>2) *або* → ***размеркавальны злучнік***, пры дапамозе якога звязаны аднародныя акалічнасці;<br>3) *сярод* → ***вытворны прыназоўнік***, які стаіць перад назоўнікам ***людзей*** у форме роднага склону і мае значэнне ‘*ў акружэнні якіх-небудзь асоб*’;<br>4) *ці* → ***пытальная часціца***, якая ўзмацняе пытальны характар выказвання | Марфалогія і арфаграфія.<br>Культура маўлення.<br>Самастойныя і службовыя часціны мовы | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 50.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 7 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 35, 41, 43, 44.<br>**З.І. Бадзевіч** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 8 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; § 4.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; §§ 35, 44, 45 |

**В10.** Вызначце спосаб утварэння прыведзеных слоў і ўстанавіце адпаведнасць паміж слупкамі табліцы. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца ўвогуле. Напрыклад: А2Б5В3Г4.

| | |
|---|---|
| **А.** Прываблівасць.<br>**Б.** БТ.<br>**В.** Загарадны.<br>**Г.** Абмен. | **1.** Бяссуфіксны.<br>**2.** Суфіксальны.<br>**3.** Прыставачна-суфіксальны.<br>**4.** Літарная абрэвіяцыя.<br>**5.** Гукавая абрэвіяцыя. |

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Адказ:** А2Б4В3Г1 | 1) *прываблівасць* → слова ўтворана суфіксальным спосабам: ***прываблів****-(ы)* + суфікс -***асць***;<br>2) *БТ* → літарная абрэвіяцыя: слова ўтворана з пачатковых літар слоў *беларускае тэлебачанне*; вымаўляецца [***бэтэ***];<br>3) *загарадны* → слова ўтворана прыставачна-суфіксальным спосабам: ***горад****-* + прыстаўка ***за****-* і суфікс -***н****-*; | Марфемная будова слова.<br>Словаўтварэнне і арфаграфія.<br>Культура маўлення.<br>Асноўныя спосабы ўтварэння слоў | **В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў дзвюх частках. Частка 2. Мінск: НІА, 2014; §§ 31, 32, 34.<br>**В.П. Красней** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з |

| Заданне. Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы ўступных іспытаў. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| | 4) *абмен* → слова ўтворана бяссуфіксным спосабам: ***абмян***/*я*/-(*ць*) + Ø (нулявы суфікс) | | беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2015; §§ 24, 37.<br>**Г.М. Валочка** і інш. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск: НІА, 2016; §§ 23, 25, 26 |



УА "РІКВ"